Установа адукацыі

«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»

**Г. М. Канцавая**

# *МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ ПРАЦЫ НАД ФРАЗЕАЛАГІЗМАМІ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ*

Дапаможнік
для студэнтаў спецыяльнасці
1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя»

Брэст
БрДУ імя А. С. Пушкіна
2019

УДК 373.3.016:811.161.3'373(075.8)
ББК 74.268.3=411.3,3я73
К19

*Рэцэнзенты:*

загадчык кафедры філалогіі УА «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», кандыдат педагагічных навук, дацэнт **Т. М. Пучынская**

дацэнт кафедры беларускай філалогіі УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Л. І. Яўдошына**

**Канцавая, Г. М.**
К19 Метадычныя асновы працы над фразеалагізмамі ў пачатковых класах : дапаможнік / Г. М. Канцавая ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2019. – 64 с.
ISBN 978-985-22-0039-4.

У дапаможніку ракрыты змястоўны бок рэалізацыі дыдактычных умоў працы над фразеалагізмамі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, прадстаўлены розныя прыёмы тлумачэння фразеалагізмаў, прапанаваны заданні, накіраваныя на засваенне матэрыялу па фразеалогіі, развіццё маўлення вучняў, набыццё малодшымі школьнікамі навыку выкарыстання вядомых фразеалагізмаў у маўленні.

Выданне адрасавана студэнтам спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя».

УДК 373.3.016:811.161.3'373(075.8)
ББК 74.268.3=411.3,3я73

**ISBN 978-985-22-0039-4**

© УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна», 2019

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА………………………………………………………….. 4
Асаблівасці фразеалагічнай працы на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі………………………………………………………………. 5
Крытэрыі адбору дыдактычнага матэрыялу для працы над фразеалагізмамі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі……… 11
Метады і прыёмы вывучэння фразеалагізмаў на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі………………………………………………… 15
Накірункі працы над фразеалагізмамі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі…………………………………………………….. 20
Прыёмы семантызацыі фразеалагізмаў беларускай мовы……………
Прыёмы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні фразеалагізмаў………………………………………………………….. 29
Гульні ў працы з фразеалагізмамі…………………………………….. 34
Выкарыстанне нагляднасці пры працы з фразеалагізмамі 40
на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ……………………………… 45
Узбагачэнне фразеалагічнага запасу вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі пры вывучэнні марфалогіі…………………….. 50
Узбагачэнне фразеалагізмамі маўлення вучняў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі на ўроках літаратурнага чытання………………... 54
Спіс выкарыстанай літаратуры………………………………………... 62

# ПРАДМОВА

Вялікую ролю ў вывучэнні беларускай мовы вучнямі І ступені агульнай сярэдняй адукацыі адыгрывае авалоданне імі фразеалагічным багаццем. Без авалодання ўстойлівымі адзінкамі немагчыма правільнае разуменне роднага маўлення як у вуснай, так і ў пісьмовай форме. Значэнне фразеалогіі для практычнага авалодання мовай абумоўлена тым, што многія ўстойлівыя адзінкі, якія змяшчаюць эмацыянальна-экспрэсіўную ацэнку фактаў, працэсаў, выкарыстоўваючыся ў маўленні, служаць камунікатыўнымі адзінкамі, іншыя, з'яўляючыся намінатыўнымі адзінкамі, часам незамяняльныя ў абазначэнні з'яў рэчаіснасці. Выкарыстанне ўстойлівых зваротаў робіць маўленне больш багатым, выразным. Устойлівыя адзінкі мовы, з'яўляючыся вынікам працяглага развіцця, фіксуюць і перадаюць з аднаго пакалення ў другое грамадскі вопыт, яны важныя не толькі як сродак камунікацыі, але і як крыніца розных грамадска-значымых звестак.

Знаёмства з фразеалагізмамі, а тым больш асэнсаванае іх засваенне, разуменне спецыфікі іх выкарыстання дазваляе значна пашырыць кругагляд вучняў. Самастойны творчы падыход да ацэнкі моўных сродкаў неабходны і таму, што з многімі ўстойлівымі зваротамі вучні знаёмяцца стыхійна, яшчэ да школы, успрымаючы іх на слых і ў большасці выпадкаў цьмяна, невыразна здагадваючыся аб іх значэнні з кантэксту. Многія ўстойлівыя адзінкі з яркай эмацыянальнай афарбоўкай нярэдка ўжываюцца і самімі вучнямі ў маўленні. Наяўнасць значнай колькасці ўстойлівых зваротаў у падручніках для пачатковых класаў і іх актуальнасць у маўленчым развіцці вучняў пацвярджае неабходнасць спецыяльнай працы па фразеалогіі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Праца па фразеалогіі павінна быць накіравана не на простае запамінанне фразеалагізмаў, а на рознабаковую разумовую дзейнасць вучняў пачатковых класаў і прадугледжваць вырашэнне наступных задач: 1) сфарміраваць у вучняў уяўленне аб наяўнасці ў мове ўстойлівых моўных адзінак, якія шырока выкарыстоўваюцца як у тэкстах мастацкіх твораў, так і ў маўленні людзей; 2) узброіць вучняў мінімальнымі тэарэтычнымі звесткамі аб найважнейшых уласцівасцях фразеалагізмаў, пазнаёміць з гісторыяй паходжання найчасцей ужывальных фразеалагічных адзінак; 3) пазнаёміць вучняў малодшага школьнага ўзросту з функцыямі фразеалагізмаў у тэкстах мастацкіх твораў (нагляднае адлюстраванне з'яў рэчаіснасці, эмацыянальна-экспрэсіўны паказ дзеянняў, лаканічнасць маўлення і інш.); 4) узбагаціць маўленне малодшых школьнікаў устойлівымі адзінкамі; 5) развіваць мысліцельныя здольнасці вучняў; 5) сфарміраваць уменні ўсвядомленага выкарыстання вывучаных фразеалагічных адзінак ва ўласных выказваннях.